# РОЛЯ СЕТКІ ІНТЭРНЭТ У ФАРМІРАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

*Вабішчэвіч А. С., Хаджынава К. А.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэопубліка Беларусь*

*Пятрова Н. Я. – к.філал.н., дацэнт*

У рабоце разглядаецца роля сеткі інтэрнэт у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Вызначаецца, што такое самасвядомасць, нацыянальная самаідэнтыфікацыя; звяртаецца ўвага на асноўныя адметнасці (адзнакі) беларускай нацыянальнай самасвядомасці, называюцца найбольш папулярныя сайты (рэсурсы) у інтэрнэце, якія звязаны з фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Феномену, які зараз называецца інтэрнэтам, ледзь споўнілася чвэрць стагоддзя, і тым не менш зараз ён з'яўляецца важным складнікам жыцця чалавека амаль ва ўсіх сферах яго дзейнасці. інтэрнэт можна вызначыць як камунікатыўную супермагістраль, якая звязвае ўвесь свет, дапамагаючы розным людзям лёгка ўваходзіць у кантакт, бачыцца ці размаўляць адзін з адным, а таксама імгненна абменьвацца інфармацыяй з адной кропкі зямнога шара ў іншую. інтэрнэт і яго выкарыстанне ў вышэйшай адукацыі палепшылі развіццё навукі і садзейнічалі віртуальнаму ўзаемадзеянню для абмену вынікамі даследаванняў.

Звернемся да ролі сеткі інэрнэт у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці. Спачатку адзначым, што такое самасвядомасць. Пад ёй звычайна вызначаюць «разуменне сябе, свайго значэння, сваёй ролі ў жыцці і грамадстве» [1]. У філасофскім энцыклапедычным слоўніку самасвядомасць вызначаецца як «усведамленне, адзнака чалавекам свайго светапогляду, мэт, інтарэсаў і матываў паводзін, цэласная адзнака самога сябе. Носіць грамадскі характар: мера і зыходны пункт адносін чалавека да самога сябе – іншых людзей» [2].

Разам з тым, трэба размяжоўваць паняцці нацыянальнай і этнічнай самасвядомасці. Так, нацыянальная самасвядомасць – гэта ўсведамленне сябе часткай сваёй нацыі, да якой чалавек належыць, поўнае адчуванне таго, што твая нацыя – гэта тая сапраўдная нацыя, што юнавала, існуе і будзе юнаваць. Гэта і веданне сваёй нацыі, яе гісторыі, культуры, пачуццё годнасці за сваю нацыю, за сваю Радзіму. Самасвядомасць асобы вызначаецца ўсведамленнем чалавека сваёй дзейнасці, пачуццяў, думак, матываў паводзін, інтарэсаў, свайго месца ў грамадстве. На фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці ўплывае гісторыя народа, культура і мова як частка культуры. Калі захоўваецца самасвядомасць і ўсведамленне народам сваёй гістарычнай ролі і еднасці з этнасам, то захоўваецца і прагрэсіўна развіваецца нацыя. Этнічная самасвядомасць – адна з разнавіднасцей групавой свядомасці. Яна ўяўляе сабой структуру, якая складаецца з усведамлення этнічнай супольнасці і адносін да другіх народаў, прыхільнасць да нацыянальных каштоўнасцей, мовы, культуры, тэрыторыі, усведамленне сацыяльна-дзяржаўнай еднасці, патрыятызм.

Звернем увагу на такі факт, што самасвядомасць мэтазгодна разглядаць на ўзроўні асобы, сацыяльнай групы або класа, этнічнай еднасці або грамадства. Катэгорыя нацыянальнай самасвядомасці раскрывае якасную характарыстыку народа на нацыянальнай ступені яго развіцця. Гэта якасная рыса нацыі – вышэйшая форма этнічнай самасвядомасці.

Кожная асоба разумее сваю прыналежнасць да канкрэтнага этнасу па наступных крытэрыях: паходжанне; знешні выгляд; антрапалагічныя рысы; асаблівасці культуры і мовы; менталітэт; агульнасць гістарычнага мінулага і т. п. Але на розных этапах гістарычнага развіцця гэтыя рысы праяўляюцца па-рознаму. Разгледзім гэта на прыкладзе беларускага народа.

Так, беларусы сталі захавальнікамі асноўных рыс беларускага этнасу, культуры, гэта народ, які ва ўмовах шматвяковага нацыянальнага прыгнёту збяр родную мову, культуру і духоўныя каштоўнасці. Сучасная нацыянальная самасвядомасць беларусаў адрозніваецца талерантнасцю, адчуваннем блізкасці да славянскіх народаў, рускага ў першую чаргу, імкненнямі да духоўнага развіцця, да займання пачэснага месца сярод іншых народаў свету [3].

Даследчыкі адзначаюць, што нацыянальная самасвядомасць грунтуецца на нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Вызначым, што гэта такое. Нацыянальная самаідэнтыфікацыя – гэта працэс фарміравання і выражэння асобы, звязаны з адчуваннем прыналежнасці да пэўнай нацыі. Гэта паняцце ставіцца да сэнсавай ідэнтычнасці, якую індывіды надаюць сваёй нацыянальнасці, культуры і мове [4]. Не выклікае сумненняў, што народ – гэта носьбіт культуры і традыцый. Рост культуры любой асобы абумоўлены перш за ўсё знаёмствам з культурнай асновай сваёй краіны і гісторыяй свайго народа. Людзі атрымліваюць інфармацыю пра гэта рознымі спосабамі. хтосьці аддае перавагу чытанню кніг, газет, часопісаў, хтосьці атрымлівае веды ў навучальных установах. Але апошнім часам людзі ўсё часцей звяртаюцца па дапамогу да сучасных тэхналогій. Безумоўна, у наш час самым распаўсюджаным спосабам атрымання інфармацыі стаў інтэрнэт. Таму, на нашу думку, інтэрнэт можна лічыць таксама і адным з найважнейшых сродкаў фармавання самасвядомасці любога народа, у тым ліку і беларусаў.

Агульнавядома, што на прасторах сусветнай сеткі можна знайсці шмат сайтаў, звязаных з нацыянальнай самасвядомасцю беларусаў. На гэтых рэсурсах найперш можна даведацца пра Рэспубліку Беларусь як пра краіну са старажытнай гісторыяй, адметнай прыродай, багатай культурай і самабытнай мовай. Мы прааналізавалі самыя распаўсюджаныя інтэрнэт-рэсурсы, якія, на наш погляд, уплаваюць на беларускую самасвядомасць, і вызначылі самыя папулярныя з іх. Наступныя інтэрнэт-сайты, на нашу думку, з'яўляюцца найбольш карыснымі і актуальнымі ў працэсе фарміравання беларускай самасвядомасці.

1. Belarus.by – афіцыйны сайт Рэспублікі Беларусь, на якім прадстаўлена інфармацыя пра краіну па такіх раздзелах, як асноўныя факты, геаграфія, насельніцтва, клімат і надвор'е, гісторыя, рэлігія, адукацыя, культура, нацыянальныя святы, прырода, архітэктура, кухня, спорт, вядомыя беларусы, гуманітарнае супрацоўніцтва, СМІ ў Беларусі [5];
2. Sb.by – электронная газета «Савецкая Беларусь» - галоўныя навіны дня Беларусі і рэгіёнаў, інфармацыйная стужка навін, навіны Беларусі і свету, падзеі дня і апошняй гадзіны, аналітыка, каментары і многае іншае [6];
3. Беларуская электронная бібліятэка «Беларуская палічка» [7];
4. Be.wikipedia.org (Беларуская Вікіпедыя) – беларускамоўны раздзел Вікіпедыі [8];
5. Belhistory.com – спецыялізаваны рэсурс па пытаннях гісторыі Беларусі ад першабытных часоў да канца XX ст. [9];
6. Nib.by – сайт Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі як захавальніцы магутнага беларускага інфармацыйнага рэсурсу [10].

Таксама лічым, што самасвядомасць беларусаў шырока праўляецца ў інтэрнэце падчас ўдзелу яго карыстальнікаў ў сацыяльных сетках, форумах, блогах і іншых віртуальных суполках. індывідуальныя тэксты, меркаванні, асабістыя фота і відэа спрыяюць разуменню ўспрымання Беларусі ў міжнароднай супольнасці. Напрыклад, мноства блогераў актыўна выкарыстоўваюць беларускую мову для стварэння кантэнту, які

прысвечаны розным аспектам беларускай культуры, гіторыі, мовы і традыцый. Таксама у сацыяльных сетках можна вельмі часта знойдзіць актыўныя групы і старонкі, якія прысвечаны розным аспектам беларускай культуры, гісторыі і мовы, дзе людзі абменьваюцца інфармацыяй, думкамі і практычным досведам. Таму лічым, што самасвядомасць беларусаў у інтэрнэце адлюстроўваецца шматлікімі формамі актыўнасці, якія дазваляюць прадстаўляць беларускую культуру і традыцыі шырокай сусветнай аўдыторыі.

Арганізацыя і ўдзел у разнастайных інтэрнэт-акцыях, гульнях, апытаннях, анлайн-галасаваннях таксама дазваляе беларусам выказаць сваю пазіцыю ў вэб-прасторы і ўплываць на фарміраванне самасвядомасці іншых людзей. У інтэрнэце можна знайсці вялікую колькасць беларускамоўных сайтаў, прысвечаных беларускай гіторыі, культуры, мове і літаратуры. Гэта дапамагае як беларусам, так і замежным карыстальнікам больш даведацца пра культуру нашай краіны.

Мы лічым, што ў сучасным грамадстве менавіта беларускія інтэрнэт-рэсурсы, напрыклад, вэб-сайты, блогі, форумы і сацыяльныя сеткі, найперш адыгрываюць уплыў на выяўленне беларускай ідэнтычнасці ў свеце. іх дзейнасць дазваляе беларусам абменьвацца думкамі, выказваць сваё меркаванне, дэманстраваць сваю культуру і традыцыі. Актыўнасць беларускіх карыстальнікаў у сацыяльных сетках і на форумах таксама спрыяе папулярызацыі беларускай культуры і традыцый. Гэта садзейнічае стварэнню пазітыўнага іміджу Беларусі і яе народа ў сусветнай грамадскай думцы. Таму, на наш погляд, асабліва важна, каб беларускія інтэрнэт-рэсурсы былі даступны і пашыраны ў глабальнай сеткавай супольнасці. Гэта дапаможа прадстаўляць беларускую культуру, мову і традыцыі шырокай аўдыторыі.

Каб пацвердзіць свой погляд наконт адлюстравання самасвядомасці беларусаў у інтэрнэце, мы правялі сацыялінгвістычнае апытанне сярод студэнтаў нашага ўніверсітэта. У ім ўдзельнічала 426 чалавек, у асноўным гэта былі студэнты 1-га курса. Рэспандэнтам было прапанавана 10 пытанняў, якія, на нашу думку, адлюстроўваюць пэўную ступень сфарміраванасці беларускай самасвядомасці ў маладых карыстальнікаў інтэрнэту. Сярод анкетных пытанняў былі такія, што звязаны з выкарыстаннем беларускамоўнага кантэнту ў інтэрнэце як з боку толькі яго прагляду, так і з боку аўтарства. Таксама былі пастаўлены пытанні пра зацікаўленасць моладзі беларускай прэсай, літаратурай, наогул беларускай культурай.

Па выніках апытання была зроблена табліца аб ролі сеткі інтэрнэт ў фармаванні самасвядомасці беларусаў (гл. табліцу 1):

Табліца 1 – Роля сеткі інтэрнэт у фарміраванні самасвядомасці беларусаў.

| Пытанне | Адказы студэнтаў (%) | | | |
|---|---|---|---|---|
| Як часта вы глядзіце кантэнт на беларускай мове? | Часта (31,7%) | Рэдка (24,4%) | Бывае (34,1%) | Ніколі (9,8%) |
| Ці выкарыстоўваеце вы беларускую мову ў паўсядзённым жыцці? | З сябрамі/сям’ёй (31,7%) | Не выкарыстоўваю (9,8%) | Ад выпадку да выпадку (41,5%) | Так, у жыцці размаўляю па-беларуску (17,1%) |
| Ці чытаеце вы беларускую прэсу? | Так (83,4%) | | Не (16,6%) | |
| Як часта вы наведваеце выставы/музеі, звязаныя з беларускай культурай? | Часта (58,9%) | Рэдка (24,3%) | Не наведваю (16,8%) | |
| Ці публікуеце вы кантэнт на беларускай мове? | Так (65,9%) | Не (12,2%) | Рэдка (22%) | |
| Ці ўдзельнічаеце вы ў мерапрыемствах, прысвечаных папулярызацыі беларускай культуры? | Так (89%) | | Не (11%) | |
| Ці адчуваеце вы сябе часткай беларускай нацыі? | Так (100%) | | Не (0%) | |
| Ці слухаеце вы беларускую музыку? | Так (96,1%) | | Не (3,9%) | |
| Дзе вы часцей за ўсё шукаеце інфармацыю аб беларускай культуры? | інтэрнэт (87,8%) | Тэлебачанне (7,3%) | Кнігі/газеты/часопісы (2,4%) | Выставы /музеі /тэатры/кіно (2,4%) |
| Як вы думаеце, ці шырока вядома беларуская культура за межамі нашай краіны? | Так (90,7%) | | Не (9,3%) | |

Такім чынам, па выніках апытання, можна зрабіць выснову, што большасць рэспандэнтаў лічаць, што Рэспубліка Беларусь шырока вядомая за сваімі межамі. Апытаная моладзь на 100% усведамляе сябе як частку

беларускай нацыі. Большасць рэспандэнтаў чытае беларускую прэсу і слухае беларускую музыку. На жаль, толькі невялікая частка рэспандэнтаў не выкарыстоўвае ўвогуле беларускую мову ў паўсядзённым жыцці, але таксама ёсць і тыя, хто свядома размаўляе па-беларуску. Таксама большая частка апытаных студэнтаў удзельнічае ў папулярызацыі беларускай культуры: наведваюць мерапрыемствы, прысвечаныя беларускай культуры, выставы, музеі і іншыя мерапрыемствы, звязаныя з беларускай культурай, публікуюць кантэнт на беларускай мове і т. п. Меншая частка апытаных студэнтаў ніколі не глядзіць кантэнт у інтэрнеце на беларускай мове. З апытання таксама можна зрабіць выснову, што сусветная сетка з'яўляецца самай папулярнай крыніцай для пошуку інфармацыі сярод моладзі.

У заключэнне выкажам меркаванне, што інтэрнэт адыгрывае надзвычай важную ролю ў станаўленні нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. Гэта дазваляе людзям актыўна ўдзельнічаць у культурным і грамадскім жыцці краіны, прадстаўляць беларускую мову, гісторыю і звычаі шырокай аўдыторыі, дзяліцца ідэямі і практычным вопытам. У выніку гэты сродак становіцца важнай пляцоўкай для фарміравання і ўмацавання нацыянальнай самасвядомасці нашага народа.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Ожегов, С. И. Толковый словарь русского языка / С. И. Ожегов, Н. Ю. Шведова. – 4-е изд., доп. – М., 1999. – С. 144.*
*2. Философский энциклопедический словарь / гл. ред.: Л. Ф. Ильичев [и др.]. – М., 1983. – С. 418.*
*3. Беларусазнаўства / гал. рэд.: А.І. Павачка [і інш.]. – Мінск, 2003. – С. 34-49.*
*4. Что такое национальная самоидентификация? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://mealblog.ru/cto-takoe-nacionalnaya-samoidentifikaciya. – Дата доступа: 25.11.2023.*
*5. Belarus.by [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.belarus.by. – Дата доступу: 25.11.2023.*
*6. Sb.by [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу: https://www.sb.by. – Дата доступу: 25.11.2023.*
*7. Беларуская электронная бібліятэка «Беларуская палічка» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://knihi.com. – Дата доступу: 25.11.2023.*
*8. Беларуская Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Галоўная_старонка. – Дата доступу: 25.11.2023.*
*9.. Nlb.by [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: https://nlb.by. – Дата доступу: 25.11.2023.*